# “ Беларускія народныя гульні, як сродак далучэння дзяцей да беларускай мовы”

Вялікую ролю у фарміраванні грамадзянскіх рыс характару дзіцяці адыгрываюць народныя гульні. Праз гульню дзяцей далучаюць да радаснага знаёмства з навакольным светам. У гульні найбольш поўна праяўляюцца творчыя здольнасці выхаванцаў, фантазія, іх чалавечыя якасці. Усе народныя гульні - калектыўныя, у іх гуляюць гуртам. І ад таго, як будзе паводзіць сябе тое ці іншае дзіця, залежыць эмацыянальны стан усіх прысутных дзяцей.

У гульнях дзеці непрыкметна для сябе вывучаюць родную мову.



Незалежна ад зместу, характеру гульні выконваюць важную ролю як сродак фізічнага, эстэтычнага, інтэлектуальнага выхавання дзяцей. Ужо першыя прымітыўныя гульні, якія пачынаюцца ў калыскавы перыяд, выяўляюць фізіялагічныя і эмацыянальныя патрэбы і імкненні немаўляці, а таму аказваюць вялікі ўплыў на станаўленне чалавека як асобы, на яго сталенне. Калектыўныя гульні падрослых дзяцей набываюць характар грамадскага з'явішча і адыгрываюць вялікую ролю ў сацыяльнай пазіцыі чалавека. Беларускі этнограф і фальклярыст Е. Р. Раманаў яшчэ ў мінулым стагоддзі слушна падкрэсліў гэты бок дзіцячых гульняў: «Калі дзеці гуляюць з равеснікамі, яны ў кожным выпадку рана і міжволі прывучаюцца суадносіць свае паводзіны з паводзінамі іншых, што ў сваю чаргу важна ў сэнсе ранняга разумення кожным сваіх грамадскіх абавязкаў у адносінах да іншых».

Функцыя гульняў у розныя часы мяняецца, як мяняецца і іх тэматыка. Традыцыйныя народныя гульні, звязаныя з гаспадарчымі справамі, жыццёвымі адносінамі паміж людзьмі ў пэўныя перыяды, зараз маюць значэнне не столькі для выхавання адпаведных навыкаў і засваення нормаў паводзін у пэўных сітуацыях, колькі пазнавальнае. Яны садзейнічаюць выхаванню такіх рысаў у характары чалавека, якія не трацяць каштоўнасці ў любы час. Скажам, усім вядомая простая гульня ў хованкі, якая некалі мела вельмі сур'ёзную мэту - навучыць дзіця імгненна схавацца пры першай небяспецы, схавацца ад драпежніка ці ворага, сведчыць пра ўмовы жыцця старажытных людзей, а ў сучасных дзяцей развівае назіральнасць, кемлівайць, хуткасць рэакцыі - якасці, заўсёды прыдатныя ў жыцці.

Цяжка пераацаніць значэнне ролевых гульняў, якія называлі таксама сімвалічнымі. У іх спалучаюцца драматызацыя, песеннасць, паэтычнае аздабленне з пластыкай і спартыўнасцю. Такія гульні-прадстаўленні разыгрываюцца па усіх правілах драмтычнага мастацтва, толькі, падобна народным дзействам абрадавага характеру (купалле, вяселле і г.д.), самі выканаўцы з'яўляюцца адначасова і гледачамі. Як у сапраўдным прадстаўленні, у гульнях нароўні з галоўнымі ролямі, з тымі, хто вядзе прадстаўленне, вялікае месца адводзіцца радавым удзельнікам: статыстам, натоўпу. Ролевыя гульні не выходзяць з агульнага рэчышча дзіцячага фальлору, у іх дзейнічаюць прадстаўнікі жывёльнага свету, яны звязаны з прыродай, бытам беларускай вёскі («Гусі», «Пастух і авечкі», «Пячэнне хлеба» і інш.). Яны дапамагаюць дзецям успрымаць мастацкае слова ў сувязі з сітуацыйнымі дзеяннямі, развіваюць фантазію, даюць прастор для творчай ініцыятывы. Хоць змест іх, сюжэт і вызначаны традыцыяй, але аздабленне дыялогу паэтычнымі дэталямі залежыць ад мастацкіх здольнасцей удзельнікаў. Асабліва гэта

датычыцца гульняў, сэнс якіх у прыдумванні дзеянняў для кожнага удзельніка, гульняў з фантамі, з жартоўным прадказаннем лёсу.

Як і ўсе жанры фальклору, гульнёвы фальклор з'яўляецца надзейным захавальнікам роднай мовы, а засваенне яе у працэсе гульні - самы хуткі і цікавы для дзяцей шлях.

Рухомыя фальклорныя гульні нарадзіліся ў натуральным асяроддзі, гулялі ў іх нашы продкі на свежым паветры. Таму ў добрае надвор'е гульні лепш праводзіць на спартыўнай пляцоўцы ці на ўчастку дзіцячага садка.

Удзел дарослага ў гульнях стварае ў дяцей адпаведны настрой. У час гульні выхавальнік дапамагае дзецям глыбей пранікнуць у яе змест, знайсці неабходныя выразныя сродкі для перадачы вобраза, крытычна прааналізаваць асабістыя дзеянні і адносіны да сяброў. Гульні з удзелам дарослага носяць больш творчы і працяглы характар.

Дзеці старэйшага дашкольнага узросту здольны пачынаць гульні па асабістай ініцыятыве. Выхаванцы вызначаюць вядучую лінію гульні, самастойна шукаюць шлях перадачы вобраза, ацэньваюць дзеянні удзельнікаў, іх творчыя здольнасці. І што вельмі важна, вучацца рэгуляваць адносіны, якія могуць адмоўна ўплываць на гульню. Лепшай ацэнкай сталасці дзяцей можа стаць працягласць гульні на даволі доўгі час.



Гульні праводзяцца без музычнага суправаджэння — так, як у іх гулялі спакон веку.

Гульні мэтазгодна праводзіць на занятках. Напрыклад, пры знаёмстве дзяцей са святамі Каляд у першай палове дня выхавальнік расказвае аб свяце, яго удзельніках, развучвае з дзецьмі вершы, калядныя песні У другой палове дня праводзіць з дзецьмі гульню "Каляда". Пры знаёмстве хлопчыкаў і дзяўчынак з абрадамі "ваджэння казы" у першай палове дня выхавальнік расказвае дзецям пра абрад, развучваюць вершы ці песні да гульні, робяць адзенне для мужыка, маску "казы". У другой палове дня праводзіцца гульня "Каза" ці "Казёл".

Дзякуючы паступовай падрыхтоўцы да свята дзеці з цікавасцю прымуць удзел у святочным ранішніку.

Вялікая роля ў правядзенні заняткаў належыць выхавальніку. Пры знаёмстве з новай гульнёй, абрадам дарослы павінен растлумачыць дзецям с энс многіх слоў, якія сустракаюцца упершыню. Гэта не толькі ўзбагаціць слоўнікавы запас выхаванцаў, але і будзе садзейнічаць іх агульнаму развіццю.

Праводзячы гульню, трэба дапамагчы дзецям зразумець характэрныя рысы кожнага героя, тыя абставіны, у якіх яны дзейнічаюць. Гэта дапаможа дзіцяці больш праўдзіва адлюстраваць свае пачуцці, паверыць у тое, што адбываецца ў адносінах паміж персанажамі. Разам з тым дзеянні кіраўніка не павінны навязваць дзецям гатовых рашэнняў.